Правілы папярэдняга запісу на абслугоўванне ў падраздзяленнях
ААТ «ААБ Беларусбанк»

Паважаны кліент!

Для рэгістрацыі папярэдняга запісу паслядоўна выберыце аперацыю, падраздзяленне банка (пры рэгістрацыі на сайце банка, у сістэме дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання), даступныя дату і час абслугоўвання.

Абавязковымі рэквізітамі для рэгістрацыі з'яўляюцца імя, імя па бацьку (пры наяўнасці), а таксама нумар мабільнага тэлефона ў міжнародным фармаце і(або) адрас электроннай пошты.

Па заканчэнні рэгістрацыі Вашаму папярэдняму запісу будзе прысвоены рэгістрацыйны нумар, які спатрэбіцца для абслугоўвання ў выбраны Вамі дзень. Рэгістрацыйны нумар будзе аўтаматычна накіраваны Вам у выглядзе SMS-паведамлення або ў выглядзе паведамлення на адрас электроннай пошты.

Максімальная колькасць рэгістрацый на папярэдні запіс адным кліентам на працягу аднаго каляндарнага дня не можа перавышаць двух разоў.

Пры звароце ў падраздзяленне банка для абслугоўвання па папярэднім запісе увядзіце рэгістрацыйны нумар у меню электроннай сістэмы кіравання чаргой (далей – ЭСКЧ) «Папярэдні запіс», атрымайце талон і чакайце выклік спецыяліста. Атрыманне талона на абслугоўванне даступна не раней чым за 5 мінут да і не пазней за 5 мінут пасля наступлення забраніраванага часу.

У выпадку, калі выбранае падраздзяленне банка не абсталявана ЭСКЧ або ў меню ЭСКЧ адсутнічае ўкладка «Папярэдні запіс», для арганізацыі абслугоўвання па папярэднім запісе паведаміце рэгістрацыйны нумар кіраўніку або кансультанту (у выпадку іх адсутнасці – іншаму спецыялісту) падраздзялення банка.

Для абслугоўвання на працоўнае месца спецыяліста Вас запросяць (не раней чым за 5 мінут да наступлення забраніраванага часу) пасля завяршэння абслугоўвання цяперашняга кліента, кліентаў, якія маюць права на пазачарговае абслугоўванне, кліентаў, якія заключылі дагавор на персанальнае абслугоўванне ў рамках клуба «Персона».

Важна! У выпадку адсутнасці ўводу рэгістрацыйнага нумара на працягу 5 мінут з моманту наступлення забраніраванага часу ў меню ЭСКЧ «Папярэдні запіс» у выбраным падраздзяленні банка або Вашага спазнення на пазначаны або больш працяглы час, Ваш папярэдні запіс анулюецца. Далейшае абслугоўванне ажыццяўляецца ў парадку чаргі.

У выпадку страты рэгістрацыйнага нумара абслугоўванне па папярэднім запісе магчыма пасля яго атрымання ў кіраўніка або кансультанта падраздзялення банка, у якое зроблены запіс. Рэгістрацыйны нумар паведамляецца пры супадзенні прадастаўленых Вамі даных (імя, імя па бацьку (пры наяўнасці), мабільнага нумара тэлефона або адраса электроннай пошты, назвы аперацыі (паслугі)), з данымі, унесенымі пры рэгістрацыі.

Вы можаце адмяніць свой папярэдні запіс на сайце банка, у тэрміналерэгістратары ЭСУО, у сістэме дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання. Для адмены запісу абавязковым з'яўляецца ўвод рэгістрацыйнага нумара.

Звяртаем увагу, што рэгістрацыя папярэдняга запісу не з'яўляецца абавязацельствам банка па абслугоўванні па канкрэтнай аперацыі ў выбраныя дзень і час. Банк мае права адмены папярэдняга запісу, пры гэтым прымаюцца меры па інфармаванні кліента аб адмене запісу з дапамогай тэлефоннай сувязі і (або) электроннай пошты. Банк не нясе адказнасць за неатрыманне кліентам інфармацыі аб адмене папярэдняга запісу.